ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
26 верасня 2003 г. № 1217

## 5/13080 (30.09.2003) Аб зацвярджэнні Урадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на 32-ю сесію Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць Урадавую дэлегацыю Рэспублікі Беларусь на 32-ю сесію Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, якая будзе праходзіць з 29 верасня па 17 кастрычніка 2003 г. у г. Парыжы (Французская Рэспубліка), у наступным складзе:

| | | |
|---|---|---|
| Мартынаў Сяргей Мікалаевіч | – | Міністр замежных спраў (кіраўнік дэлегацыі) |
| Шчасны Уладзімір Рыгоравіч | – | старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (намеснік кіраўніка дэлегацыі) |
| Ананіч Лілія Станіславаўна | – | намеснік Міністра інфармацыі |
| Гуляка Леанід Паўлавіч | – | Міністр культуры |
| Жук Аляксандр Іванавіч | – | першы намеснік Міністра адукацыі |
| Сівалобава Алена Аляксандраўна | – | начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльна-культурнай сферы Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь |

2. Камандзіраваць у г. Парыж (Французская Рэспубліка) у адпаведнасці з пунктам 1 дадзенай пастановы – з 27 верасня па 22 кастрычніка 2003 г. У. Р. Шчаснага, з 2 па 5 кастрычніка 2003 г. А.І.Жука і С.М.Мартынава, з 8 па 11 кастрычніка 2003 г. Л.С.Ананіч, Л.П.Гуляку і А.А.Сівалобаву.

Фінансаванне расходаў па камандзіраванню членаў дэлегацыі ажыццявіць у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 верасня 2002 г. № 1331 «Аб удасканаленні арганізацыі і фінансавання службовых камандзіровак за мяжу» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., № 111, 5/11207).

3. Зацвердзіць Пазіцыю Урадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на 32-ю сесію Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА (прыкладаецца)*.

**Выконваючы абавязкі Прэм'ер-міністра
Рэспублікі Беларусь** **С.Сідорскі**

* Не рассылаецца.